Лісоўская В. А.,
*студэнтка Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў*

Міцкевіч А. Г.,
*старшы выкладчык Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў*

Барткова М. М.,
*мастак-рэстаўратар Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту*

## ТРАДЫЦЫЙНЫ ПОЯС: арыгінал і копія (2007 г.)

Пояс неад'емная дэталь строя розных слаёў традыцыйнага грамадства — мае вельмі высокі семантычны статус, які доўга захоўваўся ў свядомасці найбольш кансерватыўнага стану — сялянства. Пояс суправаджаў чалавека праз усё жыццё, з'яўляўся неад'емным атрыбутам большасці абрадаў. Адсутнасць пояса азначала прыналежнасць да хтанічнага свету [1, с. 391—392]. Гэты статус, магчыма, і тлумачыць тое, што «народныя» паясы не сталі таварным прадуктам і выкарыстоўваліся толькі для ўласных патрэб.

Розныя тэхнікі вырабу беларускіх народных паясоў вядомыя з даўніх часоў. Унікальнасць сітуацыі на Беларусі ў тым, што тэхнікі гэтыя добра вядомыя і вывучаюцца на розных узроўнях (ад школы да ВНУ) і з'яўляюцца прыкладам неперарванай трансляцыі традыцыі.

Паводле матэрыялу паясы можна падзяліць на суконныя (аснова і ўток ваўняныя) і паўсуконныя (уток і частка асновы льняныя).

Асноўнай сыравінай для вырабу паясоў была авечая воўна і лён хатняга прадзення, афарбаваныя як традыцыйнымі раслiннымі, так і хімічнымі сродкамі. Льняныя ніткі, калі яны ішлі на аснову, часам адбельвалі, фарбавалі рэдка. З фабрычных нітак выкарыстоўвалі тонкую воўну-жычку, белую баваўну.

Па спосабе вырабу паясы дзеляцца на плеценыя (на пальцах, на калодачцы, на вілачцы, на сцяне, шыдэлкам і пруткамі) і тканыя (на дошчачках, на ніту, на бердзечку, на кроснах) [2, с. 404, 409—410].

Аснову калекцыі БДМНАіП складаюць паясы, датаваныя І паловай XX ст., адзінкі — канцом XIX ст. Дрэнная або фрагментарная захаванасць паясоў з'яўляецца перашкодай для іх залічэння ў музейны фонд. Музейныя прадметы, візуальна непашкоджаныя пры паступленні, з розных прычын трацяць фізіка-хімічныя ўласцівасці валокнаў і разбураюцца. Пры экспанаванні ў неадпаведных умовах, напрыклад, у экспазіцыі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

музеяў-скансэнаў, ткацтва найбольш падвержана паскоранаму старэнню і дэградацыя валокнаў наступае на працягу некалькіх год. Калі ўлічыць высокую верагоднасць біялагічнага пашкоджання, то небяспека страціць музейны прадмет становіцца відавочнай.

На дадзены момант можна акрэсліць наступныя праблемы:

— працягласць і складанасць рэстаўрацыі тканых і плеценых паясоў;

— выключэнне з музейнага фонду (спісанне з-за дэструкцыі) азначае знішчэнне рэшткаў магчыма унікальнага прадмета;

— недасканалая атрыбуцыя (часам недакладнае апісанне тэхналогіі, толькі чорна-белая фотафіксацыя, адсутнасць схемы запраўкі ніцей узору) не дазваляюць узнавіць страчаны па розных прычынах арыгінал.

Вырашэннем гэтых праблем можа стаць выкананне якаснай атрыбуцыі студэнтамі ў рамках вытворчай практыкі, а таксама выраб копій як пашкоджаных, так і добра захаваных паясоў для далейшага экспанавання і выкарыстання ў рэканструкцыі абрадаў.

Для вырабу копіі неабходна:

1) веданне тэхнікі пляцення або ткацтва;

2) наяўнасць аўтэнтычных або максімальна блізкіх матэрыялаў (ніткі хатняга вырабу, афарбаваныя, пажадана, па даўніх тэхналогіях).

У Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў на кафедры народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва даўно вядзецца вывучэнне традыцыйных тэхнік і рамёстваў. Вопыт адной з аўтараў, якая ў 2007 г. праходзіла вытворчую практыку ў Беларускім дзяржаўным музеі народнай архітэктуры і побыту, дазволіў:

1) зрабіць рэканструкцую пояса, які з'яўляўся канструктыўнай дэталлю андарака КП 4204 Т2 708;

2) зрабіць копію пояса (КП 5795 Т2 967) са збору БДМНАіП, які паводле інфармацыі з уліковай карткі дакументацыі выкарыстоўваўся ў вясельным абрадзе;

3) папоўніць музейную калекцыю копіямі паясоў з Валожынскага р-на са збораў музеяў у Івянцы і Ракаве (ім прысвоена ўліковае абазначэнне НД 6759 — НД 6762);

4) перадаць у культурна-адукацыйны аддзел копіі паясоў для выкарыстанняў культурна-адукацыйных мерапрыемствах.

Працэс падбору і падрыхтоўкі матэрыялу для вырабу копій самы праблемны. Знайсці адпаведныя спрадзеныя ўручную ваўняныя і льняныя ніткі цяпер вельмі цяжка. Афарбаваць у адпаведны колер і адценне

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

яшчэ складаней. Для вырабу прадстаўленых копій выкарыстаны ўласныя, у тым ліку аўтэнтычныя, ніткі аўтараў. Белая воўна фарбавалася ў зялёны, фіялетавы, ружовы колеры прамысловымі анілінавымі фарбавальнікамі (ООО «Технохим», СПб ТУ 2461-001-53276892-2000), у чорны — сумессю раслінных фарбавальнікаў [3, с. 261—276].

Выраб копій у супрацоўніцтве са студэнтамі БДУКіМ і іншых ВНУ, пры належным забеспячэнні неабходнымі матэрыяламі, можа быць прадуктыўным шляхам як папаўнення музейнай калекцыі, так і вырашэння культурна-адукацыйных задач музея. Вельмі важнае папаўненне калекцыі па рэгіёнах шляхам абмену копіямі можа стаць плённым кірункам супрацоўніцтва паміж рознымі музеямі Беларусі, так і замежнымі, у зборах якіх захоўваюцца датаваныя больш ранні́м часам аўтэнтычныя паясы або іх замалёўкі XIX ст.

*Літаратура*


1. Беларуская міфалогія: Энцыклапед. слоўн. / С. Санько (і інш.); склад. І. Клімковіч. – 2-е выд., дап. – Мн.: Беларусь, 2006.
2. Этнаграфія Беларусі: энцыкл. – Мн.: БелСЭ, 1989.
3. Энциклопедия забытых рецептов: Практическое руководство по изготовлению разнообразных изделий и продуктов. – М.: ННН, 1994.
4. *Байбурин, А. К.* Пояс (к семиотике вещей) / А. К. Байбурин // Из культурного наследия народов Восточной Европы: Сборник музея антропологии и этнографии. – СПб., 1992.
5. *Селівончык, В. І.* Беларускія народныя паясы / В. І. Селівончык. – Мн., 1989.
6. *Маслова, Г. С.* Народная одежда русских, украинцев и белорусов / Г. С. Маслова // Восточнославянский сборник. – М., 1966.
7. Матэрыялы навукова-практычнай канферэнцыі «Народныя паясы – мастацтва и рамяство». – Мн.: БелДІПК, 1994.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ